Кацярына Біруля (Мінск, БДУ)

# МАТЫВЫ І ВОБРАЗЫ ЛІРЫКІ АНДРЭЯ ЗЯЗЮЛІ

Творчасць каталіцкага святара Аляксандра Астрамовіча з'яўляецца цікавай старонкай у гісторыі беларускай літаратуры. На паэтычнай ніве ён друкаваўся пад псеўданімам Андрэй Зязюля. З 1905 па 1910 гг. А. Астрамовіч вучыўся ў Пецярбургскай духоўнай семінарыі. Службу ксяндза ён пачаў у мястэчку Трабы (цяпер Іўеўскі раён), дзе гаварыў касцельныя казанні па-беларуску. Пасля служыў ксяндзом у Ракаве, Новым Свержані, Анопалі, Смілавічах і Сянно. За прыхільнасць да беларускага слова праследаваўся касцельнымі ўладамі. Аляксандр Астрамовіч прымаў актыўны ўдзел у грамадскім жыцці Беларусі, у тым ліку ўдзельнічаў у З'ездзе беларускага каталіцкага духавенства ў Мінску ў 1917 г. Друкавацца пачаў у перыядычных выданнях «Наша ніва», «Biełarus», «Kryniсa», «Вольная Беларусь» і інш.

Творчая спадчына А. Зязюлі невялікая: гэта зборнік вершаў «З роднага загону» (1913), паэма «Слова праўды аб мове і долі беларуса» (1917), вершаванае апавяданне «Аленчына вяселле» (выдадзена ў 1923 г.). Памёр паэт у 1921 годзе. У 1931 годзе ў Вільні намаганнямі святара, сябра і паплечніка Адама Станкевіча пабачыла свет 2-е выданне зборніка А. Зязюлі «З роднага загону», прымеркаванае да 10-й гадавіны з даты яго смерці. Туды ўвайшлі вершы, паэма і вершаванае апавяданне. У прадмове, даючы ацэнку творчай спадчыне паэта, ксёндз Адам Станкевіч адзначыў: «Многа вершаў знаходзілася ў прафесара Б. Эпімах-Шыпілы, ксяндза А. Сака, Янкі Купалы, кс. Хведзькі» [2]. Можна меркаваць, што поўная спадчына А. Зязюлі яшчэ не сабраная.

Назва зборніка «З роднага загону» гаворыць сама за сябе і носіць ярка выражаны патрыятычны пафас, які быў уласцівы творцы. Родны загон — любая сэрцу паэта Беларусь.

У прадмове да кнігі Адам Станкевіч распавядае пра жыццё і дзейнасць паэта і падкрэслівае, што ўжо перад навучаннем у Пецярбургскай духоўнай семінарыі А. Астрамовіч быў свядомым беларусам. Асабліва на яго патрыятычную фармацыю паўплывала знаёмства з вядомым прафесарам Б. Эпімах-Шыпілам, які працаваў у Пецярбургскай духоўнай акадэміі. Ён пазнаёміў студэнтаў з выданнямі «Дудка беларуская» і «Смык беларускі» Ф. Багушэвіча.

Адраджэнскі пафас паэзіі Ф. Багушэвіча аказаў вялікі ўплыў на станаўленне беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя. Гэты ўплыў адчуваецца ў паэзіі класікаў Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча. Адчуваўся ён і ў творчасці духоўных асобаў К. Сваяка, А. Зязюлі, В. Адважнага. Прадмовы да кніг «Дудка беларуская» і «Смык беларускі» сталі своеасаблівым маніфестам нацыянальнага адраджэння. Асабліва востра ў прадмовах ставілася пытанне роднай мовы, якое было ўзята за першаснову ў працы і творчасці святароў. Мова — сакральная, святая, скарб ад Бога, як адзначаў Ф. Багушэвіч. Асноўная мэта наступных пакаленняў — зберагчы яе.

І каталіцкі касцёл гэтаму дапамагаў. Святары выступалі перад народам з казаннямі на беларускай мове, выдавалі малітоўнікі, арганізоўвалі гурткі па вывучэнню мовы. Моўнае пытанне заўсёды стаяла востра, асабліва падчас працэсаў русіфікацыі і паланізацыі, якія перашкаджалі паўнацэннаму развіццю беларускай мовы. Дзякуючы натхнёным дзеячам мова захоўвалася, гучала з амбона ў словах малітвы. Менавіта ў гэты цяжкі перыяд і працаваў паэт-святар Андрэй Зязюля.

Паэзія Андрэя Зязюлі насычана хрысціянскай сімволікай. Любоў да Бога і бліжняга, роднай Айчыны — вось ключавыя матывы яго паэзіі.

Зборнік «З роднага загону» складаецца з раздзелаў: І. Рэлігійны; ІІ. Народны; ІІІ. Беларускае жыццё; IV. Беларуская прырода; V. Настроі; VI. Розныя. Вершы аб’яднаны ў раздзелы тэматычна.

Адкрываецца кніга нізкай рэлігійных вершаў. Разглядаючы творчасць паэта, даследчык літаратуры Уладзімір Конан у зборніку «З роднага загону» заўважыў сумяшчэнне двух асноўных архетыпаў беларускай класічнай паэзіі — ранні элегійны матыў Беднага Лазара і пазнейшы мажорны матыў вітаізму (ад лац. vita — жыццё), узвышэнства, праслаўлення, красы роднага краю, архетып Раю [3, с. 19].

У раздзел «Рэлігійны» ўключаны вершы-малітвы, вершы-інтэрпрэтацыі на псальмы («З псальму», «Голас крыжа», «Судзі мяне», «Ружанец», «Алелюя», «Малітва да Маці Божай Вастрабрамскай»). Верш «З псальму» яўна пераклікаецца з Нагорнай пропаведдзю Ісуса Хрыста і з матывамі першага псальма. Па-свойму паэтычна яго інтэрпрэтуе А. Зязюля:

Шчаслівы, хто ў раду благіх не ўступае,
Хто выбраў вузкую дарогу <…>
Шчаслівы, хто Богу на службу аддаўся <…>
Шчаслівы, хто верным ва ўсім Яму стаўся <…> [2, с. 19].

У вершы гучыць і тэма заклікання да святарскай службы. Святар — чалавек, які цалкам аддаецца на службу Богу і бліжняму, выбраўшы вузкі і цярністы шлях Хрыста. Лірычны герой верша А. Зязюлі перакананы, што сапраўднае шчасце ёсць у прабыванні з Богам.

Верш «Песня Беларусі» можна назваць своеасаблівым хрысціянскім гімнам. Гэта шчырая малітва за краіну і яе народ. Лірычны герой з верай моліцца аб лепшай будучыні для сваёй краіны. У творы гучаць адраджэнскія матывы. Рухаючай сілай жыцця выступаюць вера, надзея і любоў — асноўныя тэалагальныя цноты:

Асвяці наш розум верай,
І надзею ў душу ўлі
І агонь любові шчырай
У сэрцах нашых запалі [2, с. 36].

Магчыма, вобраз агню можна разглядаць як вобраз ачышчэння. Пад словазлучэннем «народны дом» аўтар мае на ўвазе пабудову новага грамадства, арыентаванага на дабрабыт і адраджэнне роднага краю, бо гэта ўсеагульная праца і абавязак кожнага чалавека:

Хай бяруцца да работы
Дом народны будаваць.

І багацяцца ў цноты
Каб пасля ім Рай дастаць [2, с. 37].

Вобраз раю часта сустракаецца ў паэзіі святароў. У хрысціянскім веравучэнні рай — гэта месца вечнага шчасця, куды трапляюць душы праведнікаў. У Старым Запавеце рай — зямны сад Эдэм, адкуль былі выгнаны першыя людзі Адам і Ева, у Новым Запавеце — гэта сонечны нябесны Іерусалім, горад без смутку і смерці. Творцы разважаюць пра рай на зямлі, рай як стан душы і рай у небе. У вершы спалучэнне слоў «дастаць рай» — азначае жыць згодна з цнотамі свету, па Божых законах.

На творчасць Андрэя Зязюлі аказала ўплыў лірыка Я. Купалы і Я. Коласа. Паэт шчыра апявае свой родны беларускі край. Ён паэтызуе сялянскі побыт, працу.

Максім Багдановіч у нарысе «За тры гады: Агляд беларускай пісьменнасці 1911–1913 гг.», кажучы пра газету «Biełarus», пісаў: «Шмат вершаў піша і Андрэй Зязюля, але аб ім можна сказаць толькі тое, што, напэўна, сказана ў яго пашпарце: “Каталік. Асаблівых прыкмет не мае» [1, с. 229]. На наш погляд, ужо тое, што М. Багдановіч у такім аглядзе звярнуў увагу на творчасць паэта сведчыць пра многае.

Даследчык Алег Лойка называў Андрэя Зязюлю «паэтам нацыянальна-клерыкальным, сялянска-клерыкальным», тлумачачы гэта неадрыўнасцю творцы ад роднага загону і сялянскіх побытавых малюнкаў [4, с. 411].

Асобную старонку паэзіі Андрэя Зязюлі займаюць вершы-прысвячэнні. Уваходзяць гэтыя вершы ў раздзел «Беларуская прырода» і спалучаюць у сабе жанравыя асаблівасці пейзажных вершаў і вершаў-прысвячэнняў. Напрыклад, верш «Вясна» — прысвячэнне Уладзіславу Галубку, «Веснавая раніца» — Альберту Паўловічу, «Маёвая ноч» — Браніславу Эпімах-Шыпілу, «Песня аратая» — Яну Неслухоўскаму. Гэта своеасаблівыя вершы-рэфлексіі, навеяныя прыгажосцю роднай прыроды. Даследчык У. Конан заўважыў падабенства паміж творам літоўскага паэта К. Данелайціса «Поры года» і лірычным цыклам А. Зязюлі «Беларуская прырода», у якім паэт захапляецца прыгажосцю роднага краю [3]. Кожны месяц творца апісвае вобразна, паэтычна, узнёсла. Родны хутар, роднае поле, родная песня — тыя канцэпты, якія падкрэсліваюць нацыянальную адметнасць усяго беларускага.

У сваёй паэзіі Андрэй Зязюля стварае вобраз Беларусі. Па словах А. Лойкі паэт стварыў «вобраз сялянскай Беларусі, які ўзнікае з усіх малюнкавых вершаў і песень» [4, с. 411].

Лірычны герой верша «Беларусь» — патрыёт, ён сцвярджае, што слова Беларусь — з’яўляецца каштоўным для ўсіх з маленства:

Ёсць слоўца цэннае ўсім і знамяніта,
Што вымаўляецца з пашанай дзіцянём,
У якім паняцце Бацькаўшчына скрыта, —
То Беларусь, то край, дзе мы жывём [2, с. 37].

У вершы гучыць матыў уваскрашэння, які выконваў важную ролю ў тагачасных літаратурных творах. Уваскрэсенне Хрыста атаясамліваецца з адраджэннем роднага краю. Гэты вобраз выкарыстоўвалі ў сваёй творчасці К. Каганец, Я. Купала, К. Сваяк і інш.

У вершы «Голас крыжа» аўтар праводзіць паралель паміж цярпеннямі, бедамі, няўдачамі чалавека і пакутамі Езуса Хрыста на крыжы. Крыж, як «адвечных праўд скрыжаля», з'яўляецца цэнтральным вобразам верша:

Спакойся дух, стрывожаны нягодай,
Стрымай нудлівыя парывы жалю;
Зірні на крыж, адвечных праўд скрыжалю
І кліч пачуй адтуль: «Ты мне жыццё дай!» [2, с. 28].

Праз увесь твор праходзяць матывы цярпення і змагання з нягодамі жыцця. Вобраз крыжа сімвалізуе пакуты, але адначасова з'яўляецца і сімвалам выратавання. Гэта верш-наказ для хрысціяніна. Чалавек часта ўпадае ў спакусы, з якімі трэба змагацца:

Ары, карчуй дзярван духовай нівы,
Падатны грунт для ласкі ўрабляй… [2, с. 28].

Лірычны герой верша «Ніколі» дае клятву, што ніколі не кіне народнай справы, мовы, краю, уласнай волі. Пейзажныя вобразы знітаваны з памкненнямі аўтара і сімвалізуюць перашкоды ў яго дзейнасці. Аднак лірычны герой не хоча заўважаць ніякіх перашкод, бо ідзе да сваёй мэты:

Бушуе хай бура, віхор хай злуецца,
Хай вецер панура завые на рэчцы,
Я роднага краю, што рвецца да волі, —
Не зраджу ніколі [2, с. 37].

Каб не здрадзіць, трэба мець уласную моцную волю. Лірычны герой — сапраўдны патрыёт сваёй краіны.

Такім чынам, лірыка А. Зязюлі поўная шчырага патрыятызму, сардэчнай любові да Беларусі, прасякнута глыбокай верай у лепшую будучыню беларускага народа. На думку Адама Станкевіча, Андрэй Зязюля паэт цалкам арыгінальны, які «праз увагу на змест і форму ягонай творчасці можа быць слушна названы "вясковы лірнік", які зросся ў адно цэлае з родным сялом і бесперастанку будзіць яго ад сну векавога» [2, с. 22]. У творах пісьменніка абавязкова прыстутнічае хрысціянская вобразнасць: вобразы Бога, Хрыста, святых, рая, уваскрашэння і інш. Лірычны герой паэта шчаслівы, бо выбраў для сябе шлях служэння Богу і бліжняму.

ЛІТАРАТУРА

1. Багдановіч, М. Поўны збор твораў: у 3 т. — 2-е выд. — Мінск: Беларус. навука, 2001. — 2 т. — С. 229.
2. Зязюля, А. З роднага загону. Зборнік вершаў. — Вільня, 1931.
3. Конан, У. Андрэй Зязюля: хрысціянская філасофія і асветніцкая дзейнасць // Наша вера. — 2001. — № 4. — С. 18–23.
4. Лойка, А. А. Андрэй Зязюля // Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд: у 2 ч. — Ч. 2: Падручнік для філал. фак. ВНУ. — Мінск, 1989. — С. 445–451.